Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды за акцыю супраць міліцэйскага гвалту

11.02.2016



Дом правасуддзя ў Менску.

У судзе Ленінскага раёна Мінска 11 лютага разглядаюцца адміністрацыйныя справы, складзеныя на ўдзельнікаў акцыі пратэсту супраць гвалту супрацоўнікаў міліцыі над грамадзянамі пад будынкам Вярхоўнага суду Беларусі 30 студзеня. Усяго ў той дзень былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях на 9 актывістаў партыі АГП і грамадскіх рухаў.

Перад пачаткам судовага працэсу ў Доме правасуддзя па вуліцы Сямашка, 33, супрацоўнікі міліцыі праводзілі дагляд рэчаў і правяралі пашпартныя дадзеныя грамадзян, якія жадалі патрапіць на судовыя паседжанні.

Адміністрацыйную справу прадпрымальніка **Алеся Макаева** разглядаў суддзя Андрэй Камушкін. Суддзя адхіліў хадайніцтва весці працэс па-беларуску. Сведкай з боку абвінавачвання выступаў ст. участковы інспектар Ленінскага р-на Мінска Алег Валер'евіч Кунейка.

Макаеў прызнаны вінаватым у парушэнні часткі 3 артыкула 23.34 КаАП РБ (парушэнне парадку арганізацыі і правядзенне масавых мерапрыемстваў, здзейснены паўторна на працягу года). Суд пастанавіў пакараць яго штрафам у памеры 50 базавых велічынь, альбо 10 мільёнаў 500 тысяч рублёў. Ён віны сваёй не прызнаў, сказаў, што ўдзел у акцыях – канстытуцыйнае права грамадзян.

Актывістка **Святлана Якшына**, справу якой разглядала суддзя Д. Астапенка, (частка 1 арт. 23.34 КаАП РБ) хадайнічала аб допуску абаронцы і аб азнакамленні са справай. Суд задаволіў хадайніцтва і даў час адвакату на азнаямленне ў зале суда. Высветлілася, што копія пратакола не адпавядае арыгіналу. Адвакат называе пэўныя месцы несупадзенняў. Якшына просіць адправіць пратакол на дапрацоўку. Суд пастанавіў адправіць справу на дапрацоўку, паколькі ў копіі пратаколу не напісаны артыкул і не пазначаны сведка. Суддзя сказаў, что першае - гэта грубае парушэнне і трэба пратакол дапрацаваць.

Разгледжаная адміністрацыйная справа **Ніны Багінскай**. Актывістка на суд не прыйшла, таму суддзя Астапенка прыняў рашэнне пачаць суд без яе. З пратаколу вынікае, што Багінская стаяла з бел-чырвона-белым сцягам.
У сведкі Вадзіма Сёмухі спыталіся пра абставіны справы. Кажа, што праходзіла несанкцыянаванае пікетаванне каля будынку Вярхоўнага суда. Кажа, што Багінская знаходзілася ў группе людзей і трымала бел-чырвона-белы сцяг на палачцы. Бачыў як ягоны калега Шавенька Аляксандр Сяргеевіч падыходзіў да грамадзянкі і яны размаўлялі.
Прынятае рашэнне Ніну Багінскую пакараць штрафам у памеры 25 базавых велічынь.

Справу актывіста “Еўрапейскай Беларусі” **Максіма Вінярскага** разглядала суддзя суду Ленінскага раёна Марына Запаснік. Вінярскі адмовіўся ўставаць пад час суду. Прызнае, што быў на акцыі з плакатам, але ня лічыць гэта адміністрацыйным правапарушэннем, таму віну не прызнае. Кажа, што калі складалі пратакол, то копію яму не выдалі, правы не патлумачылі.

Вінярскі распавядае суду пра выпадкі яго збіцця супрацоўнікамі міліцыі з 1999-га года за удзел у акцыях. Суддзя просіць спыніць гэты расповед. Сведкамі па справе выступалі ўчастковы інспектар Ленінскага раёна Сяргей Басалый і Сёмуха Вадзім. Сведка паведаміў, што пра акцыю яму паведаміла кіраўніцтва, аднак імя кіраўніка суддзя не дазволіла агучыць.

Актывіста абвінавацілі ў парушэнні арт. 23.34. КаАП РБ (частка 3) – удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, здзейснены паўторна на працягу года. Суд вынес пастанову – штраф у памеры 50 базавых велічынь.

Удзельніцу працэсу **Наталлю Гарачку** судзіў Андрэй Камушкін. Яе вінавацілі ў парушэнні арт. 23.34. КаАП РБ (частка 1). Сведкамі выступалі участковы інспектар Семуха Вадзім Збыслававіч і старшы ўчастковы, маёр міліцыі Факала. Паколькі паказанні сведкі Сёмухі адрозніваюцца ад паказанняў удзельніцы працэсу датычна часу прысутнасці, папярэдняга папярэджання аб "незаконных дзеяннях", пры тым, што Гарачка не бачыла Сёмухі да пачатку адміністратыўнага працэсу, справу адправілі на дапрацоўку.

Апошнюю адміністрацыйную справу ў дачыненні да **Дзяніса Красачкі** суддзя Андрэй Камушкін разгледзеў за 14 хвілін. У судовай залі прысутнічала 20 чалавек, якія прыйшлі падтрымаць актывіста. Сведкай выступаў Алег Кунейка. Пастанова суду: штраф 20 базавых велічынь.

Справы яшчэ траіх удзельнікаў акцыі **Анатоля Лябедзькі, Вольгі Маёравай** і **Мікалая Казлова** будуць разгледжаныя 16 лютага ў гэтым жа судзе.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY